# Баку для нашых не ўбаку

## КАНТАКТЫ

**23–24 лістапада ў сталіцы Азербайджана Баку прайшла Міжнародная канферэнцыя «Роля нефармальнай адукацыі ў развіцці моладзі», а таксама адбылося пасяджэнне Савета па справах моладзі краін – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

Нашу краіну ў гэтай закаўказскай рэспубліцы прадстаўлялі маладзечанцы – дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» і выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Павел Сапоцька і старшыня студэнцкай Асамблеі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Яўгеній Харук.

Канферэнцыя праходзіла ў рамках рэалізацыі Стратэгіі міжнароднага супрацоўніцтва моладзі на перыяд да 2020 года. Прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Украіны, Азербайджана, Казахстана, Кіргізіі, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана падзяліліся вопытам работы з моладдзю ў сваіх краінах, праінфармавалі аб праграмах нефармальнай адукацыі.

На абмеркаванне былі вынесены пытанні распрацоўкі Канцэпцыі развіцця супрацоўніцтва краін СНД у падтрымцы маладзёжнага валанцёрскага руху, арганізацыі ў 2017 годзе XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, падведзены вынікі рэалізацыі міжнароднага праекта «100 ідэй для СНД». Вялікую ўвагу дэлегаты надалі Маладзёжным Дэльфійскім гульням дзяржаў – удзельніц СНД.



**Павел САПОЦЬКА адказвае на пытанні журналіста аднаго з каналаў азербайджанскага тэлебачання.**

По выніках канферэнцыі прынята рэзалюцыя, над якой актыўна працавалі прадстаўнікі беларускай дэлегацыі.

Знаходзячыся ў Баку, беларусы таксама прынялі ўдзел у шэрагу сустрэч, наведалі аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку Алею ганаровага пахавання, дзе пахаваны першы Прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі Гейдар Аліеў і народны артыст Савецкага Саюза Муслім Магамаеў.

**Алесь САВІЦКІ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ